# ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

## Праграма для педагагічных каледжаў і вучылішчаў

Курс "Экалагічнае выхаванне малодшых школьнікаў" прызначаны для фарміравання ў будучых настаўнікаў гатоўнасці да экалагічнага выхавання вучняў пачатковых класаў. Навучэнцы педагагічных каледжаў і вучылішчаў павінны:

засвоіць, як выдзяляць з навакольнага жыцця эколага-педагагічныя факты і з'явы;

апісваць гэтыя факты і з'явы на мове педагагічнай навукі;

умець тлумачыць і прагназіраваць іх развіццё, абапіраючыся на заканамернасці экалагічнага выхавання як педагагічнага працэсу і асаблівасці развіцця малодшых школьнікаў.

У аснову курса пакладзены ідэі:

разуменне месца чалавека ў прыродзе і грамадстве;

усведамленне каштоўнасці прыроды;

развіццё ў вучняў патрэбнасці да зносін з прыродай і яе пазнання.

Змест курса пабудаваны з улікам аб'ектыўных тэндэнцый, якія садзейнічаюць:

фарміраванню сістэмы поглядаў і стылю дзейнасці педагога як экалагічнай асобы;

разуменню ім сутнасці ўзнікнення і вырашэння эколага-педагагічных праблем, пытанняў, задач;

фарміраванню вопыту экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў як педагагічнай дзейнасці і ўзаемадзеяння пры вырашэнні педагагічных задач.

Праграма па экалагічнаму выхаванню малодшых школьнікаў з'яўляецца часткай вучэбнага курса "Асновы пачатковага светаразумення, методыка выкладання і экалагічнае выхаванне", які вывучаецца ў педагагічным каледжы імя Максіма Танка.

Дадзены варыянт праграмы ўключае наступныя раздзелы:

I. Агульныя асновы экалагічнага выхавання школьнікаў (лекцыі — 8 гадзін, семінарскія заняткі — 2 гадзіны).

II. Сацыяльна-экалагічная сітуацыя жыццядзейнасці дзяцей (лекцыі — 8 гадзін, семінарскія заняткі — 6 гадзін).

III. Экалагічнае выхаванне малодшых школьнікаў (лекцыі — 14 гадзін, семінарскія заняткі — 12 гадзін).

### РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ АСНОВЫ ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ШКОЛЬНІКАЎ

**1. Экалагічнае выхаванне як педагагічны працэс, яго заканамернасці і прынцыпы** (лекцыі — 4 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Паняцце "экалагічнае выхаванне". "Экалагічнае выхаванне" ў шырокім (як галіна культуры) і вузкім (як педагагічны працэс) значэннях. Гісторыя яго развіцця.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця экалагічнай адукацыі ў свеце.

Экалагічная псіхапедагогіка як новы напрамак у метадалогіі педагогікі і псіхалогіі. Задачы экалагічнага выхавання і адукацыі з пазіцый экалагічнай псіхапедагогікі.

Асаблівасці экалагічнага выхавання школьнікаў — працэс шматфактарны (суб'ектыўна-аб'ектыўны), працяглы, бесперапынны; комплексны і двухбаковы характар гэтага працэсу.

Дыялектыка выхаваўчага працэсу як вырашэнне ўнутраных і знешніх супярэчнасцей.

Агульныя заканамернасці працэсу экалагічнага выхавання:

залежнасць экалагічнага выхавання ад назапашаных вопыту і ведаў дзіцяці аб прыродзе, набытых у сям'і;

залежнасць эфектыўнасці экалагічнага выхавання ад інтэнсіўнасці ўздзеяння на эмацыянальную сферу асобы;

залежнасць эфектыўнасці экалагічнага выхавання ад разумнага спалучэння педагагічнай адукацыі (інтэлектуальнага кампанента) і экалагічнай дзейнасці (паводзінскага кампанента);

залежнасць экалагічнага выхавання ад ступені самавыхавання школьніка;

залежнасць экалагічнага выхавання ад агульнага развіцця дзіцяці і ўзроўню яго экалагічнай выхаванасці.

Прынцыпы экалагічнага выхавання:

сувязь выхавання з жыццем і працай;

сістэматычнасць, паслядоўнасць, бесперапыннасць выхаваўчага працэсу, адзінства выхаваўчых уздзеянняў;

гуманізацыя, інтэграцыя працэсу выхавання;

узаемасувязь ведаў і практычнай дзейнасці;

міжпрадметная сувязь і прагнастычнасць выхаваўчай работы;

улік рэгіянальных і мясцовых умоў у змесце і арганізацыі разнастайных форм выхаваўчай работы ў школе.

**2. Задачы і змест экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў** (лекцыі — 2 гадзіны).

Задачы экалагічнага выхавання:

засваенне асноўных ідэй і экалагічных паняццяў — чалавек, свет, прырода, здароўе;

разуменне месца чалавека ў прыродзе і грамадстве;

усведамленне каштоўнасці прыроды;

свядомае прытрымліванне норм паводзін у прыродзе;

развіццё ў дзіцяці патрэбнасці да зносін з прыродай і яе пазнання.

Экалагічнае выхаванне як сістэма ведаў, перакананняў, светапоглядных пазіцый, навыкаў, устойлівых прывычак паводзін.

Эвалюцыя поглядаў на экалагічны змест выхавання школьнікаў (школа і педагогіка Л. М. Талстога, школа В. А. Сухамлінскага, вальдорфская педагогіка і інш.). Замена аўтарытарнай адукацыйнай парадыгмы гуманістычнай; антрапацэнтрычнага падыходу экацэнтрычным.

Кампаненты зместу экалагічнага выхавання:

*Пазнавальны* кампанент — ідэі і паняцці, якія характарызуюць прыроду, чалавека і грамадства ў іх узаемазалежнасці.

*Каштоўнасна-арыентацыйны* кампанент — усведамленне прыроды як універсальнай каштоўнасці ўсіх форм жыцця; упэўненасць у аб'ектыўнай неабходнасці беражлівых адносін чалавека да навакольнага асяроддзя.

*Нарматыўны* кампанент — авалоданне кожнай асобай сістэмай маральных і праваўых прынцыпаў, норм і правіл, прадпісанняў і забарон экалагічнага характару.

*Маральна-эстэтычны* кампанент — развіццё гармоніі пачуццёвай і эмацыянальнай сфер асобы; сузіранне прыроды і актыўныя гуманныя адносіны да яе.

*Дзейнасны* кампанент — віды і спосабы дзейнасці школьнікаў, накіраваныя на фарміраванне практычных уменняў экалагічнага характару, патрэбнасць у прыродаахоўнай дзейнасці.

**3. Экалагічная этыка — сучасная ідэалогія экалагічнага выхавання** (лекцыі — 2 гадзіны).

Асноўныя ідэі зместу экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў:

Прырода, Чалавек, Здароўе як універсальныя каштоўнасці жыцця;

чалавек як цэнтральная фігура захавання ўсіх форм жыцця на Зямлі;

прыроднае асяроддзе — крыніца жыцця;

прырода — крыніца выхавання;

чалавек — частка свету прыроды;

прырода — аб'ект аховы;

Зямля — мой дом;

кіраваць чалавек будзе не прыродай, а самім сабою;

неабходнасць самаабмежавання чалавека дзеля захавання жыцця;

экалагічная культура як спосаб спалучэння чалавека з прыродай;

адказнасць перад нашчадкамі як прыярытэтная мера пры прыняцці рашэнняў, якія датычацца стану прыроднага асяроддзя.

### РАЗДЗЕЛ II. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАЛАГІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ

**1. Дзіця ў свеце прыроды** (лекцыі — 4 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Эмацыянальнае ўспрыманне дзіцем свету прыроды ад парывістых эмацыянальных праяўленняў да слаба выяўленага стану эстэ-

тычных пачуццяў да любімых кветкі, дрэва, жывёлы, з'яў прыроды (усходу, захаду сонца, мудрагелістых форм аблокаў, колеравай гамы прыроды і да т. п.).

Псіхалогія дзіцячых пытанняў у адносінах да прыроды і прыродных з'яў. "Чаму?" як адлюстраванне прыроднай патрэбнасці дзіцяці ў пазнанні. Мадэль зносін дзіцяці з навакольным светам: хістанні ад бунту да паслушэнства, ад "чамучкі", які спрачаецца, да асобы, якая любіць прыроду.

Імкненне дзіцяці да незалежнасці, якая праяўляецца ў супраціўленні волі дарослых. Дзіця правярае сябе, сутыкаючыся са светам дарослых. Яно можа знарок разбурыць гняздо птушкі, сарваць расліну, якая знаходзіцца пад аховай. Прычыны дзіцячай непаслухмянасці.

Патрэбнасць дзіцяці ў адчуванні сябе заўважаным, значным, любімым, лепшым; спосабы прыцягнення да сябе ўвагі.

Дзіцячыя страхі. Страх перад з'явамі прыроды. Страх у зносінах з прыродай у постстрэсавай сітуацыі, выкліканай аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, які фарміруе стэрэатып мыслення "прырода — вораг"; страх перад пакараннем, адмоўнай адзнакай, неадэкватнымі паводзінамі дарослых.

Дзіцячая жорсткасць, якая праяўляецца ў розных формах: катаванне жывёл, злараднасць і здзек у адносінах да людзей, што яго акружаюць. Прычыны дзіцячай жорсткасці. Роля выхавання ў фарміраванні дабрыні ў адносінах да жывой і нежывой прыроды. Выхаванне навыкаў рабіць добрыя справы для знаёмых і незнаёмых людзей, усіх жывых істот, умення шкадаваць жывое.

**2. Узроставыя асаблівасці малодшага школьніка** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Узрост асобы ад 6 да 11 гадоў — гэта сенсітыўны перыяд для фарміравання асноў светаразумення. Пластычнасць нервовай сістэмы дзяцей гэтага ўзросту: непрагматычныя адносіны да прыроды, імпульсіўны характар у адносінах да жывёльнага і расліннага свету. Ярка адлюстраваная эмацыянальнасць успрымання. Творчае развіццё пачуццяў уяўлення. Наіўны суб'ектывізм і эгацэнтрызм; пошук жывых узораў для пераймання; кволасць эмацыянальных перажыванняў, унутраны індывідуалізм.

**3. Дзіця і яго здароўе** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Тэндэнцыі паслаблення псіхічнага, маральнага і фізічнага здароўя школьнікаў. Педагагічныя шляхі і сродкі захавання і ўмацавання здароўя вучняў: гігіенічная культура, фарміраванне адказных адносін да свайго здароўя і здароўя іншых людзей; папярэджванне і пераадоленне шкодных прывычак. Педагагічная прафілактыка нервова-псіхічных захворванняў.

Метады і формы гігіенічнага выхавання. Паказчыкі псіхічнага і фізічнага здароўя дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

## РАЗДЗЕЛ III. ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**1. Экалагічнае выхаванне малодшых школьнікаў як педагагічная праблема** (лекцыі — 2 гадзіны).

Экалагічны дысананс і яго ўплыў на экалагічнае выхаванне школьнікаў.

Адзінства экалагічнай адукацыі і выхавання любові да прыроды як самакаштоўнасці.

Інтэлектуальны, маральны, прававы і эстэтычны кампаненты ў экалагічным выхаванні дзяцей.

Напрамкі экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў як сістэма і цэласны педагагічны працэс.

**2. Экалагічнае выхаванне школьнікаў пачатковых класаў у вучэбным працэсе** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Экалагічныя веды як выбар правільнай лініі паводзін.

Патэнцыял і магчымасці вучэбных прадметаў пачатковай школы ў экалагічным выхаванні школьнікаў: рускай, беларускай, замежнай моў, музыкі, выяўленчага мастацтва, матэматыкі, працоўнага навучання. Прадметы гуманітарна-эстэтычнага цыкла як аснова фарміравання каштоўнасных арыентацый, ацэначных і нарматыўных меркаванняў і поглядаў на прыроду і паводзіны чалавека ў ёй.

Курс "Чалавек і свет" і яго значэнне як асновы пазнання малодшымі школьнікамі месца чалавека ў трыядзе "Чалавек — Прырода — Грамадства". Выхаванне адказных адносін да сябе, свайго здароўя, да паводзін у прыродзе; выхаванне пачуццяў абавязку і міласэрнасці да людзей як часткі прыроды.

Формы экалагічнага выхавання школьнікаў: урок, свабодная форма заняткаў, правядзенне заняткаў у лесе, скверы, парку, на прышкольным участку і да т. п. Нестандартная форма заняткаў: практычныя работы, доследы, назіранні, эксперыменты, экскурсіі, дыдактычныя і сюжэтна-ролевыя гульні, інсцэніроўкі і драматызацыі, прагляд і абмеркаванне тэлеперадач, кінафільмаў, дыяфільмаў, наведванне тэатраў, музеяў, клубаў, гутаркі, чытанне кніг і г. д. Групавыя формы работы і работа вучняў у парах. Вядзенне "Дзённікаў назіранняў" і "Календароў прыроды".

**3. Экалагічнае выхаванне школьнікаў у пазакласнай рабоце** (лекцыі — 4 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 4 гадзіны).

Пазакласная выхаваўчая работа як састаўная частка экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў.

Выхаванне чалавечнасці (дабрыні), адказных адносін да прыроды, да людзей, нашчадкаў як мэта экалагічнага выхавання.

Змест пазакласнай работы і яе сувязь з іншымі напрамкамі выхавання малодшых школьнікаў: маральным, працоўным, эстэтычным.

Прыродаахоўная дзейнасць школьнікаў як асобасна-арыентаваная дзейнасць, максімальна карысная чалавеку і грамадству.

Аб'екты экалагічнай дзейнасці малодшых школьнікаў — зямля, вада, паветра, жывёльны і раслінны свет.

Віды пазакласнай работы: калектыўная, групавая, індывідуальная.

Калектыўныя і групавыя формы пазакласнай работы: дзень (свята) лесу, дзень птушак, дзень саду; тыдзень добрых спраў; экскурсіі ў прыроду; жыццё раслін, жыццё птушак і да т. п.; праца на прышкольным участку; горад вясёлых эколагаў; зоны клопату: лясная вахта, азеляненне школы, вуліцы, падшэфнага дзіцячага сада; ролевыя экалагічныя гульні ("Хто самы кемлівы?" і інш.); вырашэнне экалагічных сітуацый; гутаркі ("Ахоўваемыя жывёлы Рэспублікі Беларусь", "Ахоўваемыя расліны Рэспублікі Беларусь"); ахова птушак.

Індывідуальная пазакласная работа: чытанне мастацкіх і навуковых твораў аб раслінах, жывёлах, прыродных з'явах, аб тым, як чалавек ахоўвае прыроду.

Афармленне альбомаў рознай тэматыкі. Аналіз тэматычных малюнкаў аб жывёльным і раслінным свеце: "Кветкавы гадзіннік", "Мой сябар", "Дзеці і качаняты", "Мы збіраем ягады", "Грыбны кошык" і г. д. Тэматычныя выставы кніг: "Птушыныя сябры", "Зялёная аптэка" і да т. п. Складанне Чырвонай кнігі роднага краю. Вырабы з прыроднага матэрыялу (шышак, жалудоў, грыбоў, гліны і інш.).

Экспазіцыя творчых работ школьнікаў. Экалагічныя плакаты, эмблемы, апавяданні і г. д.

Чытанне кніг, часопісаў, артыкулаў па экалагічных праблемах (IV клас) і падрыхтоўка да напісання заметак па экалогіі як форма пазакласнай работы для тых, хто праяўляе цікавасць да экалагічных пытанняў.

Дзіцячыя экалагічныя рухі: юннатаўскі рух, школьнае лясніцтва, атрады "зялёных" і "блакітных" патрулёў, сацыяльна-педагагічны рух "ЭКАДА".

**4. Метады экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Паняцце і сутнасць метадаў выхавання ў дзяцей асноў светаразумення і адносін да навакольнага асяроддзя. Выбар аптымальных метадаў экалагічнага выхавання школьнікаў. Прычыны (умовы, фактары) выбару настаўнікам метадаў выхавання дзяцей.

Метады фарміравання ў малодшых школьнікаў экалагічных уяўленняў, поглядаў пачатковага светаразумення: тлумачэнне, доказы, маральная ацэнка, асабісты прыклад; апавяданне, гутарка; пошукавы метад; узаемаадукацыя.

Метады прыродаахоўнай дзейнасці і фарміраванне вопыту паводзін школьнікаў у прыродзе і сацыяльным асяроддзі: практыкаванні, прывучванне, даручэнні, педагагічныя патрабаванні.

Метады стымулявання станоўчых адносін і паводзін малодшых школьнікаў у прыродным і сацыяльным асяроддзях і іх дзейнасці па ахове і абароне прыроды: патрабаванні (парада, намёк, ухваленне, асуджэнне, перасцярога), перспектыва (блізкая, далёкая, індывідуальна-калектыўная), заахвочванне (вынясенне падзякі, уручэнне

падарункаў, высокая ацэнка працы, узнагароджанне экскурсіяй, каштоўным падарункам), пакаранне (вусная заўвага, асуджэнне паводзін настаўнікам, вучнямі класа), грамадская думка.

Метады фарміравання суб'ектыўных адносін да прыроды:

*метад экалагічнай ідэнтыфікацыі.* Педагагічная актуалізацыя пастаноўкі вучня, сябе на месца таго або іншага аб'екта;

*метад экалагічнай эмпатыі.* Суперажыванне школьнікамі стану прыроднага аб'екта і спачуванне яму;

*метад экалагічнай рэфлексіі.* Самааналіз вучнямі сваіх дзеянняў і ўчынкаў у прыродзе з пункту гледжання іх экалагічнай мэтазгоднасці.

Этапы фарміравання экалагічнай асобы:

І этап — пераканане ў неадэкватнасці сваіх паводзін у прыродзе;

ІІ этап — засвойванне адэкватных "тэхналогій" узаемадзеяння з прыроднымі аб'ектамі.

ІІІ этап — чалавек успрымае прыроду як раўнапраўнага партнёра па ўзаемадзеянню, адчувае сябе яе часткай.

Эколага-краязнаўчая дзейнасць малодшых школьнікаў.

**5. Магчымая эфектыўнасць экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Экалагічная выхаванасць малодшых школьнікаў. Крытэрыі і паказчыкі экалагічнай выхаванасці дзяцей пачатковых класаў: змястоўныя (меркаванні, ацэнкі, учынкі, дзеянні); ацэначныя (матывы, погляды, арыентацыі, перакананні). Сачыненні на зададзеную тэму і іх канспект-аналіз. Методыка незакончаных сказаў; вырашэнне школьнікамі экалагічных сітуацый з неадназначным рашэннем; назіранні за паводзінамі дзяцей у прыродзе і фіксаванне вывадаў (першасных, кантрольных, падагульняючых — па гадах навучання); дыягнастычныя "зрэзы"; вядзенне "Дзённіка педагагічных назіранняў" за вучнямі; самаацэнка і ацэнка работы з вучнямі праз апытанні і анкетаванне бацькоў і г. д.

**6. Асоба настаўніка як прыклад экалагічнай асобы для школьнікаў** (лекцыі — 2 гадзіны, семінарска-практычныя заняткі — 2 гадзіны).

Настаўнік пачатковых класаў у новых сацыяльна-экалагічных умовах.

Эталоны эколага-педагагічнага прафесіяналізму: настаўнік — натхніцель, сябар прыроды, прыродалюб, эколаг-інтэлектуал, інфарматар, арганізатар; педагог — настаўнік, прыродаахоўнік, эколаг, псіхолаг, грамадзянін.

Сумесная дзейнасць настаўніка і школьнікаў у экалагічным выхаванні. Педагагічная рэфлексія і экалагічная культура настаўніка. Экалагічнае самавыхаванне настаўніка.

## МАДЭЛЬ ГАТОЎНАСЦІ ВЫПУСКНІКА ПЕДАГАГІЧНАГА КАЛЕДЖА ДА ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**1. Блок эколага-педагагічнай накіраванасці як інтэграцыйнай характарыстыкі асобы.**

Выпускнік педагагічнага каледжа павінен:

быць упэўненым у неабходнасці захавання чалавекам прыроды як універсальнай каштоўнасці ўсіх форм жыцця; у тым, што чалавек кіруе не прыродай, а перш за ўсё сабой;

валодаць светапогляднымі інтэграцыйнымі экалагічнымі ідэямі і паняццямі і іх сацыяльна-экалагічнымі аспектамі;

мець устойлівыя пазнавальныя і эмацыянальныя інтарэсы да прыроды, дзяцей (як часткі прыроды), экалагічных праблем;

усведамляць неабходнасць ажыццяўлення экалагічнага выхавання школьнікаў і пачуцця адказнасці за яго вынікі;

крытычна адносіцца да сваіх паводзін у прыродзе і да паводзін у прыродзе іншых людзей.

**2. Блок навуковай карціны экалагічнага выхавання школьнікаў як педагагічнага працэсу.**

Выпускнік педагагічнага каледжа павінен ведаць:

сутнасць экалагічнага выхавання школьнікаў як састаўной часткі вучэбна-выхаваўчага працэсу (мэтавы, змястоўны, матывацыйны, арганізацыйны кампаненты);

псіхолага-педагагічныя і метадычныя асновы экалагічнага выхавання вучняў у межах комплексу мерапрыемстваў, якія арганізуе школа (спецыяльна арганізаванае эколага-адукацыйнае асяроддзе) і іншыя ўстановы (сацыякультурнае асяроддзе);

экалагічны патэнцыял вучэбных прадметаў у ажыццяўленні экалагічнага выхавання школьнікаў.

**3. Блок эколага-педагагічных уменняў.**

Выпускнік педагагічнага каледжа павінен валодаць:

*дыягнастычнымі ўменнямі* — выяўляць узроўні экалагічнай выхаванасці асобы школьніка і калектыву; выяўляць і ацэньваць дзейнасць вучняў, калектыву ў працэсе экалагічнага выхавання;

*праектыўнымі ўменнямі* — фармуляваць мэты ўрока, серыі ўрокаў, раздзела праграмы курса навучання; мэты пазакласных мерапрыемстваў, іх паслядоўнасць у ходзе экалагічнага выхавання школьнікаў;

*канструктыўнымі ўменнямі* — распрацоўваць у мэтах экалагічнага выхавання змест урокаў; канкрэтызаваць светапоглядныя інтэграцыйныя экалагічныя ідэі; выбіраць метады навучання, выкарыстоўваючы навучальную функцыю прыроды;

*рэканструктыўнымі ўменнямі* — пераўтвараць вучэбны матэрыял розных прадметаў для стварэння праблемных педагагічных сітуацый, звязаных з жыццём, станам навакольнага асяроддзя, гаспадарчай дзейнасцю людзей і ўзроўнем іх культуры;

*камунікатыўнымі ўменнямі* — ствараць спрыяльны псіхалагічны мікраклімат у дзіцячым калектыве, ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход да вучняў (з улікам узроўню экалагічнай выхаванасці), выкарыстоўваючы зносіны з прыродай у вучэбнай дзейнасці, працы, гульні і адпачынку;

*арганізацыйнымі ўменнямі* — каардынаваць пазакласную работу па экалагічнаму выхаванню школьнікаў з настаўнікамі, вучнямі, бацькамі і грамадскасцю; праводзіць канкрэтныя мерапрыемствы (экскурсіі, святы, віктарыны, конкурсы, турпаходы і да т. п.), прыцягваць школьнікаў да экалагічна-арыентаваных таварыстваў, гурткоў, да грамадска-карыснай працы па ахове прыроды; планаваць і вызначаць эфектыўнасць разнастайных форм выхаваўчай работы па экалагічнаму выхаванню школьнікаў.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Обучение в вальдорфской школе. Сб. статей по вальдорфской педагогике. Пер. с нем. — М.: Парсиваль, 1998.
2. Концепция экологического образования в области охраны окружающей среды (проект). — Мн., 1998.
3. Прогностическая концепция целей и содержания образования. — М., 1994.
4. Дерябо С. Д., Ясвин В. А. Экологическая педагогика и психология. — Ростов-на-Дону: Феникс, 1996.
5. Лихачев Б. Т. Экопсихотерапевтические аспекты воспитания. — Педагогика, 1998.
6. Мамедов Н. М., Суровегина И. Т. Экология (учебное пособие). — М., 1996.



**Т. Р. КАЛЕННІКАВА,**
**дацэнт кафедры педагогікі,**

**А. Р. БАРЫСЕВІЧ,**
**асістэнт кафедры педагогікі БДПУ імя Максіма Танка.**